# ГОМЕЛЬ НАВЕДАЎ МІНІСТР АДУКАЦЫІ

У пярэдадзень паўстагоддзя вызвалення Гомеля ад гітлераўскіх акупантаў — 25 лістапада наш абласны цэнтр наведаў міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь В. А. Гайсёнак. Разам з ім у камандзіроўцы знаходзіўся вядучы інспектар упраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі міністэрства В. І. Бацюшка. У іх першачарговую задачу ўваходзіла азнаямленне з нядаўна атрымаўшым статус Белдзяржуніверсітэта транспарта — былым БелІІЧТам. І яно атрымалася маштабным.

Пасля гэтага адбылося пашыранае пасяджэнне вучонага савета БДУТа. Яго рэктар акадэмік П. С. Грунтоў падрабязна расказаў аб дасягненнях узначальваемай ВНУ і яе далейшых перспектывах.

Затым выступіў міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Віктар Анатольевіч Гайсёнак. Ён выказаў свае станоўчыя ўражанні ад наведвання лабараторый, кафедр, бібліятэкі, агляду інтэр'ераў, ад знаёмства з дасягнутым узроўнем навучальнай і навуковай работы і адзначыў, што Савет Міністраў не памыліўся, прыняўшы рашэнне аб пераўтварэнні БелІІЧТа ва універсітэт. Але многае яшчэ трэба зрабіць, каб мець высокі аўтарытэт універсітэта транспарта, адзінай ў рэспубліцы ВНУ, у комплексе рашаючай падрыхтоўку спецыялістаў для важнейшай галіны эканомікі. Далей В. А. Гайсёнак засяродзіў увагу на праблемах развіцця адукацыі ў рэспубліцы, як адзінай сістэмы, пачынаючы з сярэдняй школы, новых яе формаў, ад якіх у многім залежыць вузаўская падрыхтоўка. Неабходна выпрацоўка новых стандартаў адукацыі для кожнага элемента гэтай сістэмы.

ВНУ рэспублікі выпускаюць зараз спецыялістаў па прыкладна 300 спецыяльнасцях. Столькі нам не патрэбна. Неабходна каля 170 спецыяльнасцей, якія павінны быць згрупаваны па 8-мі профілях і 5-ці напрамках.

Гэта азначае, што рад факультэтаў і навучальных установ павінны перагледзець сваю структуру.

Па заканчэнні вучонага савета міністра адукацыі В. А. Гайсёнка і рэктараў акадэмікаў П. С. Грунтова з БДУТа і А. С. Шагіняна з Гомельскага політэхнічнага інстытута прыняў старшыня абласнога Савета народных дэпутатаў і яго выканаўчага камітэта М. Р. Вайцянкоў. Адбылася шчырая размова аб тым, што можа зрабіць аблвыканком у каардынацыі дзеянняў і вырашэнні некаторых вострых праблем, якія стаяць цяпер перад усімі шасцю ВНУ Гомельшчыны.

Гэта размова знайшла працяг на пасяджэнні савета рэктараў, якая адбылася вечарам таго ж дня. Яго адкрыў і вёў старшыня названага савета рэктар нашага універсітэта член-карэспандэнт АНБ Л. А. Шамяткоў. У сваім выступленні ён закрануў усе пытанні, якія найбольш хвалююць і трывожаць на сучасным складаным этапе не толькі кіраўнікоў ВНУ, іншых установ адукацыі, але і кожнага работніка вельмі важнай галіны.

На пасяджэнні савета рэктараў міністр В. А. Гайсёнак растлумачыў складанасць сітуацыі, выказваў асабістыя меркаванні аб выхадзе з яе, гаварыў аб тым, якімі шляхамі павінна ісці ў будучым адукацыя і вышэйшая школа ў прыватнасці.


# Гомельскі універсітэт



ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 18 (861) | Аўторак, 7 снежня 1993 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана 10 руб.


## НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

25-га лістапада адбылося чарговае пасяджэнне вучонага савета. Па дакладу першага прарэктара прафесара М. В. Селькіна зацверджаны правілы прыёму ва універсітэт студэнтаў на 1994—1995 навучальны год.

Вучоны савет дазволіў найбольш вопытным кандыдатам навук кіраваць падрыхтоўкай аспірантаў, прысвоіў выпускнікам аспірантуры кваліфікацыю «Даследчык», зацвердзіў тэму доктарскай дысертацыі в. а. загадчыка кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін А. Ф. Карпенкі. Зацверджаны таксама прапановы на конкурс у Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь для фінансавання ў 1994 годзе. Да друку рэкамендаваны падручнік прафесара У. В. Анічэнкі і англійскага вучонага Д. Дзінглі.

Вучоны савет выбраў па конкурсу дэканамі: дацэнта Т. В. Карпей — эканамічнага факультэта, дацэнта М. І. Старавойтава — гісторыка-юрыдычнага факультэта; на пасаду загадчыка кафедры оптыкі — доктара фізіка-матэматычных навук С. С. Гіргеля; на пасаду дацэнтаў: В. А. Ляшчынскую — па кафедры беларускай мовы, В. С. Новак — па кафедры беларускай літаратуры, У. С. Лемяшкова — па кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту, Л. А. Селькіну — па кафедры эканомікі і кіравання вытворчасцю, У. А. Караткевіча — па кафедры матэматычных праблем кіравання. Старшымі выкладчыкамі абраны: В. І. Яцухна — па кафедры беларускай літаратуры, Ю. П. Працко — па кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту, Т. Я. Магілёўцава — па кафедры фізвыхавання.

Вучоны савет прыняў рэкамендацыі ў Атэстацыйную камісію Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь аб прысваенні вучонага звання прафесара загадчыку кафедры гісторыі Беларусі, доктару гістарычных навук Э. М. Энціну, дацэнта — кандыдату эканамічных навук Л. А. Іофе з кафедры эканамічнай інфарматыкі і АСК.

## «РОЛЯ УНІВЕРСІТЭТА Ў РАЗІЦЦІ РЭГІЁНА»—

такой праблеме была прысвечана навукова-практычная канферэнцыя, якую 3 снежня правялі ў Наваполацку Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Віцебскі аблвыканком і Полацкі дзяржаўны універсітэт. Яна сабрала вядучых спецыялістаў рэспубліканскіх ведамстваў, абласнога цэнтра, навуковых і педагагічных работнікаў прадпрыемстваў, навуковых арганізацый і ВНУ Беларусі.

На пленарных і трох секцыйных пасяджэннях заслуханы актуальныя даклады і паведамленні.

Ад нашага універсітэта прыняў удзел у канферэнцыі і выступіў на ёй прарэктар па вучэбнай рабоце дацэнт М. М. Воінаў.

У той жа дзень адбылася прэзентацыя Полацкага дзяржаўнага універсітэта.

*Імі ганарыцца універсітэт*



Быць імянным стыпендыятам не толькі ганарова, але і вельмі адказна. І перад сабой, у першую чаргу, і перад аднакурснікамі, у якіх ты штодзённа навідавоку.

Поспехамі ў вучобе, сваёй жыццёвай пазіцыяй імкнецца апраўдваць званне стыпендыята імя акадэміка О. Ю. Шмідта студэнт III курса матэматычнага факультэта Генадзь Мішын.

Фота У. Чысціка.

## СТАЖЫРОЎКА— Ў КІТАІ

Усё больш пашыраецца і паглыбляецца супрацоўніцтва паміж ГДУ імя Ф. Скарыны і Пекінскім сталічным педагагічным універсітэтам. Рэгулярна праводзіцца абмен дэлегацыямі вучоных, на кантрактнай аснове ў нас вядзецца падрыхтоўка кітайскіх студэнтаў. А сёлета пасланец далёкай усходняй краіны выкладчыца рускай мовы Го Цзюнь Фань стала аспіранткай загадчыка кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства дацэнта У. І. Коваля. Ён, дарэчы, першым з вучоных ГДУ прайшоў стажыроўку ў Пекіне. На працягу ўсяго папярэдняга навучальнага года там працаваў дэкан філалагічнага факультэта дацэнт У. Д. Еўтухоў. А ў мінулым месяцы туды адправілася на паўгадовую стажыроўку загадчыца кафедры рускай мовы для замежных студэнтаў Г. А. Даўгяла.

*З прафсаюзнай канферэнцыі*

## ЯК ВЫКОНВАЕЦЦА КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР

Гэта пытанне было вынесена на разгляд прафсаюзнай канферэнцыі універсітэта, якая адбылася 29 лістапада. Першым з інфармацыяй выступіў рэктар член-карэспандэнт АНБ Л. А. Шамяткоў. Ён прааналізаваў ход выканання тых пунктаў калектыўнага дагавора, якія залежаць ад адміністрацыі. Адзначана, што большасць з іх рэалізуецца. Ажыццяўленне некаторых стала немагчымым з-за цяжкага фінансавага становішча. Прыводзіўся такі прыклад. У пачатку бягучага года Міністэрства адукацыі выдзеліла нашаму універсітэту на капітальны рамонт 15 млн. рублёў. За прайшоўшы час цэны на праектна-каштарысныя работы і будаўнічыя матэрыялы павялічыліся ў некалькі разоў. Таму ўказаная сума аказалася па сутнасці мізэрнай. Бо, напрыклад, толькі для капітальнага рамонту інтэрната № 2 патрэбна каля 80 млн. руб. У выніку спатрэбілася значнае дадатковае фінансаванне. Пытанне ў некаторай ступені ўдалося вырашыць праз Савет Міністраў рэспублікі. Аднак па-ранейшаму праблем застаецца шмат. Самому універсітэту іх не асіліць, калі не знайсці надзейных спонсараў.

У сваім выступленні Л. А. Шамяткоў значную ўвагу ўдзяліў жыллёвай праблеме. Яна і цяпер застаецца вельмі вострай. Камунальных кватэр выдзяляецца універсітэту зусім мала і чарга на іх атрыманне амаль не змяншаецца.

У плане забеспячэння шырокай галоснасці заахвочвання за добрую працу, выдатную вучобу і мерах дысцыплінарнага ўздзеяння да парушальнікаў працоўнай дысцыпліны, грамадскага і ўнутранага парадку, а таксама правядзення растлумачальнай работы па працоўнаму заканадаўству адзначана станоўчая роля шмат-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

